

Пальмовая або Вербная нядзеля святкуецца ў шостую нядзелю Вялікага посту на ўспамін "трыумфальнага ўваходу Пана Езуса ў Ерузалем", за тыдзень да Яго Уваскрашэння.

У гэты дзень у касцёлах, асвячаючы галінкі вярбы або іншых раслін, як сімвалы вясны, абуджэння, адраджэння прыроды, вернікі праслаўляюць Збаўцу, як Пераможцу смерці.

Урачыстасць Нядзелі Мукі Пана ў Лучаі распачалася традыцыйна каля прыдарожнага крыжа, непадалёк ад касцёла. Там сабраліся вернікі з упрыгожанымі "пальмамі". Прагучала Евангелле пра ўваход Езуса у Ерузалем. Пасля асвячэння "пальмаў" урачыстая працэсія на чале са святаром і міністрантамі пад спеў "Гасанна Божаму Сыну!" накіравалася ў святыню.

Лучайская парафія рыхтуецца да 250-годдзя заснавання касцёла, таму на ўваходзе ў святыню размешчаны агромністы банэр з партрэтамі фундатараў касцёла са славутага роду Агінскіх. На бакавых калоннах знайшлі сваё пачэснае месца выявы святых, якія з'яўляюцца апякунамі парафіі: святога Андрэя Баболі, святога Тадэвуша і святой Ганны.

Падчас літургіі, на якую сабраліся вернікі не толькі з Лучая, але і з навакольных вёсак (дзякуючы транспартнай дапамозе ААТ "Навасёлкі-Лучай") прагучала чытанне Мукі Пана. Скончылася ўрачыстасць традыцыйнай малітвай перад абразом Маці Божай Будслаўскай, які перэгрынуе у Лучаі – "Маці Божая Будслаўская! Штогод мы накіроўваемся да Цябе! А зараз Ты прыйшла да нас!"

Разам з пажаданнямі шчаслівага тыдня, ксёндз пробашч Мікалай Ліпскі запрасіў усіх прысутных не толькі на ўрачыстасці Пасхальнага Трыдуума, але і на асаблівую Імшу 27 красавіка, у гонар кананізацыі Папы Яна Паўла II і Папы Яна XXIII. Пасля літургіі запланаваны канцэрт знакамітага беларускага выканаўцы.

Тэкст: Лена Клімза-Колтан

Фота: Карына Радзюш







